Абазначаны першавобраз генетычна звязаны з архаічнымі ўяўленнямі аб стварэнні Сусвету, аб месцы і ролі мікракосму чалавека і сям'і ў макракасмічнай прасторы, аб барацьбе светлых і цёмных сілаў за валадаранне, у выніку чаго адбываецца перарастанне першаснай сутнасці (клопату аб бяспецы і карысці) у катэгорыю псіха-ментальную, эстэтычную, калі ўсё светлае, яснае, як узыходзячае сонца, становіцца абазначэннем прыгожага, цудоўнага, падмацаванага рытуальнымі дзеяннямі і словамі. Адбітак салярнага культу ў светапоглядзе вечнага працаўніка ўзмацняе гэты гуманістычны пачатак уяўленнямі аб анімізаваным сонцы і, дапасаваўшыся да земляробчага культу, дапаўняе старажытныя ўяўленні аб навакольным свеце, прадметы і з'явы якога ўяўляюцца па аналогіі з жыццём чалавека.

#### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Афанасьев А.Н. Поэтические воззрения славян на природу: В 3 т. – М.: «Индрик», 1994-1995. – Т. 1.
2. Буслаев Ф.И. О литературе. Исследования. Статьи. – М.: Художественная литература, 1990.
3. Казакова І.В. Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыялах беларускага фальклору). – Мінск: «БОФФ», 1999.
4. Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі / Склад. К.П. Кабашнікаў. – Мінск, 1971.
5. Ліцьвінка В.Д. Святы і абрады беларусаў. – Мінск: Беларусь, 1998.
6. Рыбаков Б.А. Язычество Древней Руси. – М.: Наука, 1988.
7. Фаминцын А.С. Божества древних славян. – С.-П.: Алетейя, 1995.
8. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края // Сб. Отделения русского языка и словесности АН. – СПб. – 1887 – 1902. – Т. 1 –3.

*Материал поступил в редакцию 20.10.08*

**MOLOSHUK I.N. Solar images byelorussian traditional folklore in a context typical beliefs**

The actuality of the given article is defined first of all by the realization of the attempt to determine the pecularities of our early ancestor's outlook, to understand and deeply essential features of our Belarusian mentality by analysing the meaning of solor symbols in folk mythology.

Folk literature is regarded as the survival of the ancient world outlook, the reflection of early cosmological perceptions at the same time special attention is paid to the solar symbols.

УДК 947(476)

***Савіч А.А.***

# НАРОДНАЯ АДУКАЦЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ СУЧАСНАГА ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНА Ў XIX – ПАЧАТКУ XX стст.

**Уводзіны.** Прадметам даследавання дадзенага артыкула з'яўляецца станаўленне і развіццё сістэмы народнай адукацыі на тэрыторыі сучаснага Івацэвіцкага раёна ў XIX – пачатку XX стст. Мэта – вывучэнне працэса фарміравання адукацыйнай прасторы на тэрыторыі Івацэвіччыны ў XIX – пачатку XX стст. У адпаведнасці з вызначанай мэтай былі пастаўлены і вырашаны задачы па выяўленні архіўных крыніц, вызначэнні сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных умоў развіцця асветы на акрэсленай тэрыторыі, асаблівасцей і спецыфікі адукацыйных працэсаў, вызначэння колькасных і якасных паказчыкаў развіцця сістэмы адукацыі на Івацэвіччыне. У сучаснай гістарыяграфіі адсутнічаюць навуковыя даследаванні, прадметам якіх з'яўляецца фарміраванне сістэмы адукацыі на тэрыторыі сучаснага Івацэвіцкага раёна ў XIX – пачатку XX стст., гэтым вызначаецца навізна і значнасць прадстаўленай працы. Вызначальнай асаблівасцю працы з'яўляецца тое, што яна напісана на падставе архіўнага матэрыялу, некаторыя дакументы ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак. У сучасных умовах умацавання суверэннай незалежнай Рэспублікі Беларусь дадзенае даследаванне бачыцца актуальным і надзённым з пункту гледжання ідэйна-палітычнага і патрыятычнага выхавання насельніцтва.

**Станаўленне і развіццё сістэмы народнай адукацыі на тэрыторыі сучаснага Івацэвіцкага раёна ў XIX – пачатку XX стст.** У XVI – XVII стст. асвета на беларускіх землях развівалася ва ўмовах барацьбы паміж праваслаўем, каталіцызмам і рэфармацыйнымі рухамі. У другой палове XVI ст. з мэтай умацавання пазіцый каталіцкай царквы ў ВКЛ распачаў сваю дзейнасць ордэн езуітаў, які карыстаўся падтрымкай урада, адкрываў школы, якія былі сродкам ажыццяўлення задач умацавання каталіцызму. Разам з гэтым, дзеля ўмацавання становішча праваслаўнай веры ў гарадах ВКЛ адбывалася стварэнне праваслаўных брацтваў, якія арганізоўвалі брацкія школы. Вядома, што пасля заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі ў 1596 г. паступова пачалося пашырэнне і ўмацаванне уніяцкай царквы. Уніяты мелі Базыльянскі ордэн, які клапаціўся пра пашырэнне асветы і ствараў свае школы. Так, напрыклад, у мястэчку Быцень існаваў манастыр базыльян, заснаваны паміж 1609–1613 гг. уладальнікамі мястэчка Трызнамі, пры якім функцыянавала Быценская школа. Гэтая, магчыма першая вядомая на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна ўстанова адукацыі, карысталася шырокай вядомасцю і аўтарытэтам. У школе вучылі пісаць і чытаць, галоўнай задачай было навучанне манахаў дысцыпліне, малітве, падпарадкаванню пастановам ордэна [13].

Больш распаўсюджанымі сталі ўстановы адукацыі на тэрыторыі Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходжання беларускіх зямель у склад Расіі, у якой у пачатку XIX ст. была праведзена рэформа сістэмы асветы, што садзейнічала ўпарадкаванню адукацыйнай сферы.

Першыя дакументальна пацверджаныя звесткі аб школах на тэрыторыі Івацэвіччыны тычацца першай паловы XIX ст. Так, выконваючага абавязкі Целяханскага благачыннага, праваслаўны святар Максім Ціхановіч у сваім рапарце ў Мінскую духоўную кансісторыю 20 снежня 1853 г. паведамляў аб існуючых на тэрыторыі благачыння т. зв. паселянскіх школах: "... В покорности припровождаю в Духовную консисторию ведомости о поселянских училищах, состоящих при Церквах: Обровской Крестовоздвиженской и при вверенной мне Глиннянской Богородичной". Пры гэтым ён звяртаў увагу на цяжкасці, з якімі сутыкаліся арганізатары школьнай справы ў сялянскім асяродку: "При прочих же Церквах сего Благочиния таковых училищ незаведено потому, 1., что дети добровольно учиться не хочут; 2., что родители их, не ощущая от учения корысти, в училище не высылают и еще отвлекают от оного домашними работами и 3., что помещики, усматривая от невежества крестьян свою пользу, просветить их страшатся. Да и сии наличныя училища, по вышесказанным причинам и по причине страшного голода, теперь в совершенном расстройстве, ибо ученики одни произвольно ходят, другие никак не ходят, а некоторые пошли по миру, ища пропитания". Бацюшка звяртаў увагу начальства на гатоўнасць святароў займацца асветніцтвам, прасіў дапамагчы забяспечыць належнае наведванне

***Савіч Аляксандр Аляксандравіч**, канд. гіст. навук, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна".*
*Беларусь, БрДУ, 224665, г. Брэст, б-р Касманаутаў, 21.*

школы дзецьмі, "чтобы дети аккуратно высылаемы были в училище и чтобы Полицейское Начальство, во всех случаях имело на училище свое влияние" [9, арк. 126].

Да свайго рапарта М. Ціхановіч дадаў дзве ведамасці аб паселянскіх шолах пры двух згаданых цэрквах у вёсках Гліннае і Обрава. Паводле гэтых дакументаў, першым на тэрыторыі сучаснага Івацэвіцкага раёна было паселянскае вучылішча ў в. Обрава, якое было адкрыта 5 верасня 1843 г. На момант складання прадстаўленай інфармацыі ў школе атрымлівалі адукацыю 6 вучняў, а менавіта, "Александр Иванов Мигло, Косьма Евфимов Лучич, Кирилл Трофимов Тыревич, Григорий Симанов Ворон, Яков Сильвестров Гашура, Иван Моисеев Гречный". Абавязкі настаўніка выконваў праваслаўны святар Сямён Шыманоўскі, які і склаў адпаведную ведамасць.

Школа ў вёсцы Обрава была адкрыта 1 лістапада 1849 г., аналагічную ведамасць склаў настаўнік школы – вышэйзгаданы святар Максім Ціхановіч. У школе вучыліся "Иван Фомин Савинский, Семен Игнатов Саганович, Стефан Иванов Огренич, Семен К. Огренич, Константин Андрей Шевчик, Иосиф Артемов Шевчик, Михаил Киприанов Евфимович" [9, арк. 127, 128].

Аднак пра ўстойлівую адукацыйную палітыку на тэрыторыі Івацэвіччыны, якая ўваходзіла ў склад Гродзенскай і Мінскай губерняў, гістарычныя крыніцы дазваляюць гаварыць толькі з другой паловы XIX ст.

Змены сацыяльна-эканамічных умоў жыццядзейнасці беларускага грамадства пасля адмены прыгоннага права патрабавалі павышэння адукацыйнага ўзроўню народа, які разумеў добрыя перспектывы адукаванага чалавека. Насельніцтва рэгёна, як сведчыць афіцыйны друк, цягнулася да асветы, выказвала сваё жаданне павышаць адукацыйны ўзровень сваіх дзяцей. На фоне сціплых звестак пра стан адукацыі на тэрыторыі губерніі, малую колькасць навучальных устаноў уражвае настойлівае імкненне простага народа да навукі, хоць адукацыйных устаноў, асноўнымі сярод якіх былі пачатковыя народныя вучылішчы, было вельмі мала. З афіцыйных дакументаў вядома, што народныя вучылішчы адкрываліся на сродкі сялян і таму павольнае павелічэнне колькасці вучылішчаў не можа быць растлумачана непрыхільнасцю сялян да школы; наадварот, у большасці, яны спачувальна ставіліся да яе патрэб і даказвалі гэта штогодным павелічэннем аддзяленняў народных вучылішч, якія адкрываліся выключна на іх сродкі і па іх уласным пачыне. Але адкрываць адначасова колькасць школ, што задавальнялі б сапраўдныя патрэбы ў адукацыі, яны не мелі магчымасцей з-за недахопу сродкаў. Недахопам школ увогуле і нераўнамерным іх размеркаваннем па мяцовасцях тлумачыцца і павольнае павелічэнне колькасці вучняў: вялікія адлегласці школ ад месца жыхарства дзяцей школьнага ўзросту часта перашкаджалі пасылаць туды дзяцей, а наймаць памяшканне ў месцы знаходжання школы многія бацькі былі неўстане [10, с. 28].

Відавочна, што існаваўшыя ў другой палове XIX ст. адукацыйныя магчымасці не маглі задаволіць попыт на павышэнне пісьменнасці насельніцтва. У 1875 г. на тэрыторыі сучаснай Івацэвіччыны існавалі народныя вучылішчы Быценскае, Дабрамысльскае, Мілавідскае, Івацэвіцкае (ці Аляксееўскае), Белавіцкае, Косаўскае, Гошчаўскае, Бусяжскае. Усе яны размяшчаліся ў вёсках – валасных цэнтрах, акрамя Аляксееўскага вучылішча, якое знаходзілася ў Боркінскай воласці. Акрамя гэтага, існавала Любішчыцкае сельскае вучылішча Боркінскай воласці. У дакументах у раздзеле "Общественныя и полуштатныя училища" прыведзены Альбянскае і Харашчанскае Косаўскай воласці [5, арк. 16, 22, 25]. У другой палове XIX ст. народныя вучылішчы былі адкрыты ў Целяханах, Горталі, Выганашчах, Святой Волі.

Значная роля ў пашырэнні адукацыі сярод сялянскага насельніцтва мелі царкоўнапрыходскія вучылішчы, якія паводле "Правіл аб царкоўна прыходскіх школах" (13.6.1884) падзяляліся на аднакласныя з 2-гадовым і двухкласныя з 4-гадовым курсамі навучання. У іх выкладаліся Закон Божы, царкоўныя спевы, чытанне царкоўнага і грамадзянскага друку і пісьма, пачатковыя звесткі па арфыметыцы, у 2-класных яшчэ і звесткі з царкоўнай і расійскай гісторыі. Паводе "Палажэння аб царкоўных школах ведамства праваслаўнага веравызнання (1.4.1902) курс навучання ў аднакласных царкоўнапрыходскіх школах павялічаны да 3 гадоў, у 2-класных – да 5 гадоў [2, с. 94].

У народных вучылішчах і царкоўнапрыходскіх школах навучанне не было накіравана на дасягненне высокага адукацыйнага узроўню, галоўнае ў навучанні сялянскіх людзей – выхаванне хрысціянскіх пачуццяў, ведання і выканання патрабаванняў праваслаўнай веры і благанадзейнасці ў адносінах да дзяржавы. Увага скіроўвалася на трывалае засваенне таго, што неабходна было "кожнаму хрысціяніну ў адносінах да царквы і дзяржавы, пры гэтым не выходзячы за межы пазнання, найбольш неабходнага ў сялянскім побыце" [9, арк. 156].

Відавочна, што акрамя чыста адукацыйных задач названыя установы былі і сродкам выхавання маладога пакалення ў прарасійскім духу. Варта адзначыць, што адукацыйныя пытанні ў беларускім краі разглядваліся і вырашаліся праз прызму палітычных задач, якія стаялі перад расійскім самадзяржаўем. Палітычнае значэнне школ у той час заключалася і ў тым, што ва ўмовах агульнага імкнення насельніцтва да школы можна было спадзявацца, што "пры ўважлівых адносінах да іх зацікаўленых асоб, у тым ліку духавенства, і гэтыя школы прынясуць не малую карысць народнай адукацыі, а разам з гэтым, як спадзяваліся афіцыйныя ўлады, канчатковаму абрусенню краю" [11, с. 39]. Вырашэнне пытання народнай адукацыі ў вялікарускім духу павінна было наблізіць мясцовае насельніцтва да Расіі, вырваць яго з-пад польскага ўплыву, садзейнічаць русіфікацыі. Таму афіцыйныя ўрадавыя органы заклапочана ставіліся да наладжвання і пашырэння школьнай сеткі на тэрыторыі беларускіх губерняў пад кантролем надзейных асоб, да якіх адносіліся праваслаўныя святары. Менавіта на іх ускладвалася адказнасць за арганізацыю і належнае забеспячэнне вучэбна-выхаваўчага працэсу ў царкоўнапрыходскіх школах. Гэтыя навучальныя ўстановы былі ўтвораны на беларускіх землях у 1866 г., а ў 1884 г. яны былі перададзены "в ведение Духовнаго начальства" [6, арк. 12, 13].

Цікавым і тыповым для гэтай тэрыторыі і часу з'уляецца сакрэтны ліст Гродзенскага павятовагаа прадвадзіцеля дваранства на імя Гродзенскага губернатара Д.М. Бацюшкова ад 9 студзеня 1891 г. У дакуменце аўтар аналізуе стан функцыянавання царкоўнапрыходскіх школ. Перш чым выказаць меркаванне аб уплыве перадачы царкоўнапрыходскіх школ пад нагляд духоўных органаў у мясцовасцях са змешаным насельніцтвам, уездны начальнік палічыў неабходным паведаміць, што ў Гродзенскім павеце жывуць сяляне-каталікі, якія пражываюць у вёсках сярод праваслаўных сялян і якія зліліся з імі, і каталікі, якія пражываюць асобна ў ваколіцах. Наколькі першыя паддаюцца ўплыву розных урадавых мерапрыемстваў, настолькі апошнія, жывучы замкнёна, асобна, жывуць сваім жыццём і сваімі традыцыямі. Пакуль гэтыя, на думку аўтара, адзіныя і існуючыя ячшчэ гнёзды ранейшай "Рэчы Паспалітай" будуць існаваць, да таго часу ніякая школа ўплываць на гэтых каталікоў не будзе, а тым больш царкоўнапрыходская школа, якая знаходзіцца пад выключным уплывам праваслаўнага духавенства [6, арк.12]. Такім чынам, асаблівасці этнічнага складу заходнебеларускіх рэгёнаў, на думку некаторых расійскіх чыноўнікаў, зніжалі эфектыўнасць ўздзеяння школ на грамадска-палітычную сітуацыю ў краі.

Прадстаўнікі расійскай адміністрацыі настойліва цікавіліся якім чынам чынам перадача сеткі царкоўнапрыходскіх вучылішч у духоўнае кіраўніцтва паўплывала на настроі мясцовага насельніцтва. У адказ на запыты вышэйстаячага начальства пайшлі паведамленні з месцаў ад цывільных і паліцэйскіх чыноў. У паведамленні Беластоцкка-Сакольскага прадвадзіцеля дваранства ад 25 студзеня 1891 г. на імя Гродзенскага губернатара паведамлялася, што перадача ў рукі праваслаўнага духавенства царкоўнапрыходскіх школ і школ пісьменнасці, "грамотности" (училищных отделений) ніякага ўплыву на змешанае праваслаўна-каталіцкае насельніцтва ў сэнсе непрыязных адносін да гэтага мерапрыемства, ці асаблівага спачування яму, не зрабіла. Сяляне ахвотна, як і раней, пасылаюць сваіх дзяцей у школу, разумеючы тую карысць, якую дзеці атрымліваюць у школах увогуле, без розніцы таго, ці знаходзіцца школа пад наглядам чыноўнікаў Міністэрства народнай асветы, ці – пад наглядам і кіраўніцтвам праваслаўнага духавенства [6, арк. 56].

Пра безумоўную карысць справе пашырэння адукацыі ў краі пасля адзначанай рэарганізацыі сістэмы адукацыі, звязанай з пера-

дачай царкоўнапрыходскіх школ у кампетэнцыю праваслаўнай царквы, дакладваў у сакрэтным рапарце губернатару міравы пасрэднік 1-га ўчастка Слонімскага павета. Ён адзначыў, што перадача ў духоўнае ведамства царкоўнапрыходскіх школ мела сваім наступствам хуткае павелічэнне колькасці школ і вучняў. Пры гэтым міравы пасрэднік сцвярджаў, што колькасць школ магла б яшчэ значна павялічыцца, калі б сяляне, у выпадку адкрыцця ў сваёй вёсцы прыходскай школы ці школы граматнасці, вызваляліся ад нясення выдаткаў на ўтрыманне міністэрскай школы, да якой прылічаны, і паслугамі якой вельмі часта не карыстаюцца з-за далёкай адлегласці. Ён лічыў, што распараджэнне аб пераходзе вучылішчных аддзяленняў (школ граматнасці) у падпарадкаванне духавенству было прынята насельніцтвам з поўным даверам і асаблівых абмеркаванняў не выклікала, бо насельніцтва прывыкла бачыць сваіх прыхадскіх святароў на чале школы і памятае яшчэ былыя царкоўнапрыходскія школы ў 1860-я гады, якія былі потым пераўтвораны ў міністэрскія. Што ж да каталікоў, то сялянскае каталіцкае насельніцтва вельмі ўстойлівае ў сваіх вераваннях і выхаванае ў больш строгіх рэлігійных традыцыях, не знаходзяцца ў плямяннай розні з праваслаўным насельніцтвам, ахвотна пасылаюць сваіх дзяцей для атрымання імі элементарнай адукацыі ў народныя вучылішчы і нават царкоўнапрыходскія [6, арк. 73-74].

Юнакі Івацэвіччыны маглі атрымліваць адукацыю, напрыклад, у іншых навучальных установах Слонімскага і Пінскага паветаў. Напрыклад, на тэрыторыі Слонімскага павета ў пачатку XX ст. існавалі: прыхадскія вучылішчы (Слонімскае 1-е прыходскае 2-х класнае, Слонімскае 2-е прыходскае 2-х класнае, Слонімскае жаночае прыходскае 2-х класнае, Слонімскае жаночае прыходскае), гарадскія вучылішчы Слонімскае 3-х класнае і 4-х класныя Ружанскае (Ражанское) і Моўчадзьскае (Молчадское); яўрэйскія навучальныя ўстановы (Слонімскае пачатковае 2-х класнае, Ружанскае (Ражанскае Т.-Тора) і школа для бедных яўрэйскіх дзяцей рамеснікаў); прыватныя вучылішчы (прагімназія Юдкоўскай і Дзярэчынскае 1-класнае для яўрэйскіх хлопчыкаў вучылішча Пінцова) [15]. Як бачна, значнае месца ў сістэме адукацыі мелі яўрэйскія вучылішчы, напрыклад, на тэрыторыі Слонімскага уезда за 1878 г. налічвалася 1 вучылішча ў Слоніме і 22 на тэрыторыі павета [8, арк. 22]. Аналагічныя навучальныя ўстановы функцыянавалі і ў г. Пінску і Пінскім павеце.

Паступова колькасць сельскіх народных вучылішч расла. У “Памятнай книжке Гродненской губернии на 1903 год” змяшчаны спіс сельскіх народных вучылішч, іх загадчыкаў і настаўнікаў: Альбянскае – А. Дзявіцкая, Булянскае – Н. Ботвіч, Бусяжскае – М. Хамічэўскі, Быценскае – М. Лесько, Белавіцкае – Н. Крот, Галынскае – Калюцкі, Гошчаўскае – А. Кісель, Дабрамысльськае – К. Рамановіч, Жытлінскае – П. Бурдзюк, Заполле-Гавейнавіцкае – М. Сегень, Косаўскае 2 кл. – Ю. Бобрык, Любішчыцкае – З. Ярашынская, Прыбараўскае – К. Калішэк, Падстарынскае – Е. Геніуш, Харашчанскае – Н. Болбас, Харашэвіцкае – С. Сілюк [12, с. 65].

Наяўныя дадзеныя сведчаць як пра збалансаваную адлюстраваную сетку народных вучылішч. Дадзеныя за 1914 г. мала чым адрозніваюцца ад прыведзенай вышэй інфармацыі: Аляксандраўскае у в. Доўгай – Міхаіл Кас’янюк; Бусяжскае 2кл. – 1-ы Сяргей Грэцкі, 2-гі Зінаіда Шчэголева; Булянскае – Аляксандр Ляўчук; Быценскае 2 кл. – 1-ы А. Лапата, 2-гі Аляксандр Шкрэбунь, 3-ці Надзея Бобрык; Белавіцкае – Вікенцій Узлоўскі; Гошчаўскае – Ігнацій Сухоцкі; Галынскае – Уладзімір Мушыц; Дабрамысльскае – В. Наўцэня, 2-я Соф’я Мукасей; Жытлінскае – Пётр Шыла; Косаўскае 2 кл. – 1-ы Юльян Бобрык, 2-гі Алімпіяда Сошына; Любішчыцкае – 1-ы Іван Калішэк, 2-гі Леаніла Кузьміцкая; Прыбараўскае – 1-ы С. Ягнешка, 2-гі Аляксандра Эканамовіч; Падстарынскае – Мітрафан Хамічэўскі; Пагорскае – Андрэй Прымак; Харашчанскае – Цімафей Буцько; Харашчызнянскае – Феадор Гергілевіч;

Галенчыцкае – Васілій Стэцкі; Квасевіцкае – Сяргей Нікалайчук; Хадаркоўскае – Неаніла Салаўёва [1, с. 325-327].

У другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя ў сістэме адукацыі востра адчуваўся недахоп педагагічных кадраў, такая сітуацыя кідаецца ў вочы і ў Слонімскім, і ў Пінскім паветах. У г. Слоніме і г. Пінску не было, як вядома, настаўніцкай семінарыі, педагагічныя кадры для рэгіёна рыхтавала Свіслацкая настаўніцкая семінарыя, выпускнікі якой, відавочна, працавалі на ніве народнай адукацыі і на тэрыторыі Івацэвіччыны. Напрыклад, у 1915 г. у Свіслацкай настаўніцкай семінарыі выкладалі 9 педагогаў, “учащих”, як іх называлі тады, атрымлівалі адукацыю 136 навучэнцаў мужчынскага полу, з іх паходзілі з дваран і чыноўнікаў 2, духоўнага звання 1, гарадскога саслоўя 5, сельскага саслоўя 128! Усе навучэнцы былі праваслаўнага веравызнання. 1914-1915 навучальны год патрабаваў на забеспячэнне функцыянавання Свіслацкай настаўніцкай семінарыі 25 926 рублёў з дзяржаўнай казны, з другіх крыніц, хутчэй за ўсё прыватных ахвяраванняў, 35 рублёў. На стыпендыі выдзялялася 10 800 рублёў [3, арк. 36].

Інструкцыямі аб арганізацыі народных школ патрабавалася выкладанне ў іх асноў хрысціянскай веры, пры гэтым павінен быў быць арганізаваны нагляд за выкладанне гэтых пытанняў з боку мясцовых святароў. Таму вельмі часта абавязкі настаўнікаў выконвалі праваслаўныя святары, яны, як правіла, былі выкладчыкамі Закона Божага, а ў значнай колькасці пачатковых вучылішч выконвалі і абавязкі настаўнікаў. Пацвярджэннем гэтаму з’яўляецца спіс пачатковых вучылішч Слонімскага павета (гл. табл. 1) на 5 чэрвеня 1914 г., які змяшчае звесткі аб колькасці вучылішч, аб выкладчыках Закона Божага (законоучителях), якія выкладалі і наглядалі за ходам адукацыі, і настаўніках-выкладчыках [15, арк. 14–19].

Як бачна з прыведзеных дадзеных, у пачатковых школах катастрафічна не хапала настаўнікаў, асоба якога мела неаспрэчны аўтарытэт сярод мясцовага насельніцтва, прычым не толькі сялянскага, з меркаваннем настаўніка лічыліся ўсе мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання.

Вядома, што народныя вучылішчы фінансаваліся за кошт сродкаў, якія паступалі ад сялянскіх збораў. У Звестках аб мясцовых сродках на ўтрыманне пачатковых вучылішч Слонімскага павета Гродзенскай губерніі на 19 красавіка 1915 г. маецца інфармацыя аб школах на тэрыторыі сучаснага Івацэвіцкага раёна, часу іх заснавання і сродках, сабраных сярод насельніцтва на ўтрыманне гэтых школ [7, арк. 9] (табл. 2).

Трэба адзначыць, што дзяржаўныя органы імкнуліся падтрымліваць народныя вучылішчы фінансавымі сродкамі. Напрыклад, у каштарысе 2-х класных і 1-класных Міністэрства народнай асветы і пачатковых народных вучылішч Слонімскага павета на 1916 год былі запланаваны выдаткі па 700 руб. на кожны клас наступных вучылішч. Напрыклад, Быценскае 2-х класнае вучылішча мела 3 класы, павінна было атрымаць 2100 руб.; Бусяжскае 2-х класнае – 1400 руб.; Глядзеньеўскае – 700 руб.; Гошчаўскае 1-класнае мела 2 класы – 1400 руб.; Дабрамысльскае 1-класнае мела 2 класы – 1400 руб.; Падстарынскае – 700 руб. [7, арк. 25, 46]. Відавочна, аналагічнае фінансавае забеспячэнне павінны былі атрымаць іншыя народныя вучылішчы рэгіёна, аднак, па прычыне ваенных дзеяняў гэтыя сродкі не маглі быць выкарыстаны на патрэбы названых школ.

Пасля ўвядзення земстваў на тэрыторыі Беларусі на Івацэвіччыне пачалі арганізоўвацца земскія школы, якія знаходзіліся пад апекай павятовых земстваў, напрыклад, Вулька-Целяханскае земскае вучылішча. Паступова менавіта на земствы перакладваўся ўвесь цяжар арганізацыі і фінансавання сістэмы народнай адукацыі. Напрыклад, Пінская павятовая земская управа на пасяджэнні 28 лютага 1912 г. у складзе старшыні А.П. Фоцінскага, членаў ўправы І.М. Генхроха, В.Г. Дзіміча, сакратара управы А.В. Сосава разглядалі зварот Пінскага інспектара народных вучылішч Г.А. Русецкага, які прасіў аб выдзяленні 570 руб. на набыццё падручнікаў для 57 неземскіх вучылішч. На пасяджэнні было адзначана, што земскі сход “у прынцыпе прызнае неабходнасць вывесці 57 міністэрскіх вучылішч з тых ненармальных умоў іх існавання, у якіх яны знаходзяцца, шляхам прыняцця ў сваё ведамства, ... многія сельскія грамады па сваёй беднасці не могуць асігнаваць сродкі на выпіску кніг і падручнікаў, у выніку гэтыя вучылішчы апынуліся ў вельмі складаным становішчы, бо без падручнікаў школы існаваць не могуць”. Павятовая земская ўправа пастанавіла выдзеліць 570 руб. на кнігі і падручнікі для 57 міністэрскіх народных вучылішч [4, арк. 111].

***Табл. 1.*** *Пачатковыя вучылішчы Слонімскага павета (1914 г.)*

| № | Пачатковае вучылішча | Выкладчыкі Закона Божага | | Настаўнік-выкладчык |
|---|---|---|---|---|
| | | выкладаюць | наглядаюць | |
| 1 | Альбянскае | | С. Сухоцкі | А. Дзявіцкая |
| 2 | Булянскае | | Айц. А. Валкоўскі | А. Ляўчук |
| 3 | Бусяжскае 2-х кл. | | Айц. А. Чэдной | С. Грэцкі, З. Шчэголева |
| 4 | Быценскае 2-х кл. 1-е | Айц. М. Юзвук | | |
| 5 | Быценскае 2-у 1 кл. | | | |
| 6 | Белавіцкае 1-е | Айц. Я. Балабушэвіч | | |
| 7 | Белавіцкае 2-е | | | |
| 8 | Глядзеннеўскае | | А. Савіцкі | В. Ануфрыеў |
| 9 | Гошчаўскае 1-е | Айц. Ст. Дзем'яновіч | | |
| 10 | Гошчаўскае 2-е | | | |
| 11 | Дабрамысльскае 1-е | | | |
| 12 | Дабрамысльскае 2-е | Айц. А. Савіцкі | | |
| 13 | Даманаўскае | | Айц. Д. Івацэвіч | П. Бяндоўскі |
| 14 | Жытлінскае | Айц. А. Нядзельскі | | |
| 15 | Квасевіцкае | | Айц. С. Сухоцкі | С. Нікалайчук |
| 16 | Косаўскае 2-х кл. 1-е | | | |
| 17 | Косаўскае 2-е 1 кл. | Айц. А. Ступніцкі | | |
| 18 | Любішчыцкае | | | |
| 19 | Падстарынскае | Айц. М. Ізвецікаў | | |
| 20 | Прыбараўскае | Айц. Д. Івацэвіч | | |
| 21 | Рудскае | Айц. П. Крэйдзіч | | |
| 22 | Скуратаўскае | | Айц. А. Ступніцкі | К. Дацкевіч |
| 23 | Харашчанскае | | Айц. А. Валкоўскі | Т. Буцько |
| 24 | Яблонская | | Айц. А.Нядзельскі | А. Бяндоўская |

***Табл. 2.*** *Фінансаванне пачатковых вучылішч у рамках сучаснага Івацэвіцкага раёна, 1915 г.*

| № | Назва вучылішча | Год адкрыцця | Воласць | Мясцовых сродкаў | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Руб. | Кап. |
| 1 | Аляксееўскае народнае вучылішча | 1861 | Боркінская | 15 | 84 |
| 2 | Альбанскае нар.вуч. | 1865 | Косаўская | 69 | – |
| 3 | Булянскае нар.вуч | 1902 | Косаўская | 120 | 36 |
| 4 | Бусяжскае 2-кл. н.в. | 1863 | Косаўская | 164 | – |
| 5 | Быценскае 2-кл. н.в. | 1862 | Быценская | 51 | 50 |
| 6 | Беланіцкае нар.вуч | 1863 | Косаўская | 102 | 90 |
| 7 | Гошчаўскае нар.вуч | 1865 | Косаўская | 48 | – |
| 8 | Дабрамысльскае нар.вуч. | 1862 | Дабрамысльская | 8 | – |
| 9 | Жытлінскае нар.вуч | 1885 | Гічыцкая | 276 | 50 |
| 10 | Косаўскае 2-кл м.вуч. | 1863 | Косаўская | 143 | 57 |
| 11 | Любішчыцкае 2-кл м.вуч | 1861 | Боркінская | 30 | – |
| 12 | Мілавідскае нар.вуч | 1863 | Дабрамысльская | 17 | – |
| 13 | Прыбараўскае 2-кл м.вуч | 1902 | Быценская | 30 | – |
| 14 | Падстарынскае нар.вуч | 1900 | Боркінская | 65 | – |
| 15 | Харашэвіцкае нар.вуч | 1864 | Косаўская | 33 | 5 |
| 16 | Харашчанскае нар.вуч | 1902 | Дзярэчынская | 45 | – |

Такім чынам, ўлады, улічваючы грамадска-палітычную значнасць адукацыі, праяўлялі клопат у дачыненні да арганізацыі школьнай адукацыі. Асабліва актыўна разгарнулася школьная справа ў 1912 г., пры чым ініцыятыва актывізацыі адпаведных дзеянняў зыходзіла ад урадавых колаў. Так, напрыклад, мінскі губернатар 18 красавіка 1912 г. звярнуўся ў Пінскую павятовую земскую ўправу з лістом. У ім паведамлялася, што таварыш Міністра ўнутраных спраў "действительный статский советник" Харузін, згодна хадайніцтву кола асоб, што цікавіліся станам школьнай справы ў заходніх губернях і жадалі дапамагаць мясцовым школам у розных баках іх жыцця, у лісце ад 5 красавіка прасіў паведаміць па магчымасці падрабязна звесткі і дадзеныя аб патрэбах розных школ, асабліва ў межах Мінскай губерніі. Асабліва Харузін цікавіўся звесткамі па наступных пытаннях: 1) у якіх населеных пунктах школьныя будынкі патрабуюць рамонта, 2) якія школы маюць патрэбу ў наглядных дапаможніках і ў якіх менавіта, 3) ці ёсць пры школах бібліятэкі для настаўнікаў і вучняў, ці патрабуецца іх напаўненне кнігамі і якімі, 4) ці маюць школы "волшебные фонари" і ці вядуцца пры іх чытанні са "световыми картинами" як для дзяцей школьнага ўзросту, так і для дарослых і 5) у якіх мясцовасцях губерніі бачыцца неабходнасць будаўніцтва новых школ [4, арк. 75].

Павятовыя інспектары народных вучылішч накіравалі адпаведныя распараджэнні настаўнікам народных вучылішч, у кіх выказвалася просьба выказацца адносна магчымых фундатараў (попечителей) школ з ліку заможных і аўтарытэтных мясцовых грамадзян, а таксама тых, хто жадаў бы пабудаваць за свой кошт школьныя будынкі для наступнай арэнды іх інспекцыяй народных вучылішч. У адказ на гэты зварот у павятовыя органы адукацыі пайшла інфармацыя ад настаўнікаў народных вучылішч, якія прадстаўлялі падрабязную інфармацыю аб стане школьных будынкаў, забяспечанасці, мэбляй, вучэбна-метадычнай літаратурай і нагляднасцямі, аб школьных участках, прадстаўляючы схематычныя планы наяўных будынках і прышкольных участкаў.

Напрыклад, настаўнік Святавольскага народнага вучылішча Дзмітрый Смаршчок 29 кастрычніка 1912 г. паведаміў: "Его Высокородию Инспектору народных училищ Пинского уезда. Во исполнение предписания от 20 октября за № 3982 честь имею доложить Вашему Высокородию, что, по моему мнению, мог бы быть полезным вверенному мне училищу в качестве попечителя помещик имения Пляньты (1 вер. от Святой Воли) дворянин Владислав Францевич Пусловский, жительствующий в им. Альбертин Слонимского уезда (адрес его гор. Слоним). Названный помещик, владея большой площадью леса в Святовольской и Телеханской волостях, в случае согласия его на утверждение попечителем училища, не откажется, я полагаю, оказать училищу помощь лесным материалом при постройке нового училищного здания, в каковой постройке уже теперь является крайняя необходимость, так как настоящее училищное здание тесно, холодно и ветхо. Классная мебель училища будет вполне удовлетворять гигиеническим требованиям, если заменить 4 скамейки таковыми же системы профессора Эрисмана. Лиц, желающих возвести училищное здание при условии заключения долгосрочной аренды, нет" [14, арк. 79, 123, 124]. Аналагічнага кшталту інфармацыю прадстаўлялі настаўнікі іншых народных вучылішч.

**Заключэнне.** У XIX ст. – пачатку XX ст. на тэрыторыі сучаснага Івацэвіцкага раёна асветніцтва паступова станавілася неад'емнай часткай сацыяльна-эканамічнага і грамадска-культурнага жыцця. Ад царкоўнай асветы, якая не атрымала шырокага распаўсюджання ў рэгіёне ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай, адбываўся пераход да фарміравання свецкай адукацыі, якая ў складзе Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. атрымала пашырэнне, дзякуючы рэформам, што ажыццяўляліся як частка агульнарасійскіх пераўтварэнняў. Аснову адукацыі складалі народныя вучылішчы, значным у адукацыйным працэсе было месца царкоўнапрыходскіх школ, паселянскіх, школ пісьменнасці, на тэрыторыі сучаснага Івацэвіцкага раёна шырока распаўсюджанымі былі яўрэйскія вучылішчы. Сістэма адукацыі была накіравана на вырашэнне палітычнай задачы пераарыентацыі мясцовага насельніцтва з Польшчы на Расію, умацоўваючы пазіцыі праваслаўя, выхоўвала падрастаючае пакаленне ў прарасійскім накірунку. Таму дзяржаўныя органы праяўлялі значны клопат ў арганізацыі школьнай справы, забяспечваючы арганізацыйна-кадравыя і фінансава-матэрыяльныя патрэбы народнай адукацыі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Адрес-календарь і Справочная кніжка Гродненской губерніі на 1914 г. Издание Гродненского Губернскаго Статистическаго Комитета. – Гродна: Губернская Типография, 1913.
2. Васовіч, С. Царкоўнапрыходскія школы / С. Васовіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 2. – Мн.: БелЭН, 2003.
3. Ведомости о числе учебных заведений в Гродненскай губерніи за 1914 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Ф. 14. – В. 1. – Спр. 460.
4. Дело о перепіске с Земской Управой, о закрытии курсов по сельскому хозяйству и ведомости о содержании училищ // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінск (НГАБ у г. Минск). – Ф. 639. – Воп. 1. – Спр. 3.
5. Дело о составлении подробной карты Гродненскай губерніи в масштабе 3-х вёрст // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 11. – Воп. 1. – Спр. 419.
6. Дело о состоянии церковно-приходских и школ грамоты Гродненской губ. После передачи их из ведомства Министерства Народного просвещения в духовное // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 14. – В. 1. – Спр. 458.
7. Инспектор народных училищ Слонимскаго уезда. Ведомости на ассигнование денег для народных училищ, списки учителей начальных училищ уезда и др. // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 839. – В. 1. – Спр. 294.
8. Списки народных училишч за 1878 г. // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 14. – В. 1. – Спр. 579.
9. О поселянских училищах, состоящих при церквах Минской епархии за 1853 год // НГАБ у г. Минск. – Ф. 639. – Воп. 1. – Спр. 25072.
10. Обзор Гродненскай губерніи за 1883 год (Приложение к всеподданейшему отчёту).
11. Обзор Гродненскай губерніи за 1884 год (Приложение к всеподданейшему отчёту).
12. Памятная книжка Гродненской губернии на 1903 год. Издание Гродненскаго Губернскаго Статистическаго Комитета. – Гродна: Губернская Типография, 1903.
13. Піліпчук Р. Ад продкаў ідзе гісторыя / Р. Піліпчук // Івацэвіцкі веснік. – 1994. – 5 ліпеня.
14. Рапорты и донесения учителей народных училищ Пинского у. о состоянии школьных зданий (приложение: планы школьных зданий и приусадебных участков) // НГАБ у г. Минск. – Ф. 639. – Воп. 1. – Спр. 1.
15. Списки начальных училищ Слонимскаго уезда Гродненской губернии ведамства М.Н.П. // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 839. – Воп. 1. – Спр. 274.


*Материал поступил в редакцию 13.11.08*


**SAVICH A.A. Public education of modern Ivacevichi region in the XIX – beginning of XX centuries**

The questions of public education formation and development in the XIX – beginning of XX centuries are considered in the article. The author shows socio-economic and socio-political conditions of forming an educational space, financial- pecuniary and organizational problems of development public education sphere on the base of archival material, the private documents of this material are introduced into practice at first time. It was marked, that Russian government solved political and ideological problems through education except the solution of only educational problems itself. These problems are connected with the re-orientation of the aboriginal population in Russia, increasing the authority of the Orthodox Church, decreasing of Polish – Catholic influence on the population of Byelorussian land.


УДК 94(438)

***Кабот Т.Ф.***

# РАЗВИТИЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В ПОЛЕССКОМ ВОЕВОДСТВЕ В МЕЖВОЕННЫЙ ПЕРИОД

Профессиональное образование занимало важное место в новой системе образования, сформировавшейся в Польше в межвоенный период.

Развитие профессионального образования регулировалось рядом правовых актов. Под сильным давлением крестьянских партий был принят закон от 9 июня 1920 года о народных сельскохозяйственных школах. Опосредованное влияние на профессиональное образование имели статьи Конституции 1921 года, запрещающие использовать труд детей до 15 лет. Решающую роль сыграл закон о системе образования от 11 марта 1932 года, который окончательно завершил формирование системы организации профессиональных учебных заведений, сделав их интегральной частью системы образования. Закон конкретизировался распоряжением Министерства вероисповедования и просвещения от 21 ноября 1933 года. Последним правовым актом был закон от 1937 года о профессиональных училищах повышения квалификации [1].

***Кабот Т.Ф.**, кандидат исторических наук, доцент, Учреждение образования «Брестский государственный университет им. А.С. Пушкина». Беларусь, БрГУ, 224665, г. Брест, б-р Космонавтов, 21.*